# Scott Horne

, Edmonton

**Artist page :** https://www.free-scores.com/Download-PDF-Sheet-Music-shorne.htm


## About the piece

| | |
|---|---|
| **Title:** | The Internationale in Byelorussian |
| **Composer:** | Degeyter, Pierre |
| **Arranger:** | Horne, Scott |
| **Copyright:** | Creative Commons Licence |
| **Instrumentation:** | Piano solo |
| **Style:** | National Anthems |
| **Comment:** | «The Internationale» in Byelorussian, for solo piano. |


## Scott Horne on free-scores.com

This work is not Public Domain. You must contact the artist for any use outside the private area.
Prohibited distribution on other website.

- share your interpretation
- comment
- contact the artist

*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Інтэрнацыянал

Тэкст Эжэна Патье
Пераклад Янкі Купалі

Муз. П’ера Дэгейтэра
Аранж. П. Скотта Хорна (P Scott Horne)




Гэты твор твор даступны на ўмовах ліцэнзіі Creative Commons Пазначэнне аўтарства — На тых самых умовах 4.0 Міжнародны.
free-scores.com




1. Устаньце, парыі планеты,
Ахвяры голаду і зла!
Кіпіць, імкнучыся да мэты,
Наш розум, прагны да святла!
Свет гвалту, здзекаў мы разбурым,
Ушчэнт разбурым, а на ім
Свет шчасця і дабра збудуем:
Хто быў нічым, той стане ўсім!

*Рэфрэн:*
Барацьбы з капіталам
Бой апошні ідзе.
Інтэрнацыяналам
Яднайся, род людзей!

2. Ніхто не вызваліць ніколі:
Ні Бог, ні цар і ні герой —
Сябе пазбавім мы няволі
Мы самі, дружнай грамадой!
Каб свой забраць кавалак хлеба,
Рабаўнікоў за горла ўзяць —
Надзьмем мяхі: жалеза трэба
Пакуль гарачае каваць!

3. Закон з нас робіць вінаватых,
Падаткі смокчуць нашу кроў.
Дзяржава дбае пра багатых,
А праўда бедных — енк без слоў.
Але даволі мы маўчалі,
І час даўно наспеў сказаць:
«Каб праўды болей не таптаі,
З кален патрэбна праўду ўзняць!»

4. Агідны вы, як крывасмокі,
Чыгунак, шахтаў каралі!
Бо вы, з людзей піючы сокі,
Свае ўсе скарбы набылі.
І колькі б іх вы ні хавалі,
Ужо тых скарбаў лёс відаць:
Усё, што вы нарабавалі,
Павінны будзеце аддаць!

5. Цары не зманяць нас дурманам:
Народу — мір, царам — вайна!
І забастоўкаю тыранам
Адкажа армія сама!
Няхай тыраны прымушаюць
У бой смяротны крочыць нас, —
Салдаты ў іх паразражаюць
Свае гарматы у адказ!

6. Рабочым толькі і сялянам
Належаць гмахі і палі,
А дармаедам і тыранам
Не будзе месца на Зямлі!
Няхай драпежнікаў бясконца
Дзяўбуць драпежна груганы,
А нам жа ранішняе сонца
Заззяе промнямі вясны!

P Scott Horne (scott.horne@mail.mcgill.ca), 2021
free-scores.com